# Арганізацыя і дзейнасць медыцынскай секцыі Інстытута беларускай культуры ў 1920-я гады

УДК 61(091) «1920»



**Аляксей КАПЛІЕЎ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

Аляксей КАПЛІЕЎ. Арганізацыя і дзейнасць медыцынскай секцыі Інстытута беларускай культуры ў 1920-я гады. У артыкуле рэканструяваны перадумовы і этапы станаўлення медыцынскай секцыі Інстытута беларускай культуры ў 1920-я гады. Паказана роля з'яўлення нацыянальнага навуковага цэнтра ў развіцці айчыннай медыцыны і аховы здароўя.
Ключавыя словы: ахова здароўя, БССР, Інстытут беларускай культуры, медыцынская секцыя, навука, навуковая тэрміналогія.

Aliaksiej KAPLIYEŬ. Organization of the medical department at the Institute of Belarusian Culture in the 1920s. The article describes the prerequisites, immediate factors and stages in the formation of the medical department at the Institute of Belarusian Culture in the 1920s. The author highlights the importance of the emergence of the national scientific center for the development of domestic medicine and healthcare.
Keywords: healthcare, BSSR, Institute of Belarusian Culture, medical department, science, scientific terminology.

Стагадовы юбілей стварэння Інстытута беларускай культуры (Інбелкульт), што адзначаўся ў мінулым годзе, актывізаваў увагу даследчыкаў да вывучэння гісторыі гэтай установы, аднак навідавоку традыцыйна засталіся пераважна гуманітарныя аспекты працы навукоўцаў Інбелкульта. Насамрэч, на пачатку яго дзейнасці большасць даследаванняў тычылася пытанняў гісторыі і культуры, аднак з цягам часу інстытут разгарнуў шырокую актыўнасць і ў прыродазнаўчым кірунку, у тым ліку медыцынскай навуцы, што не знайшло значнага адлюстравання ў гістарыяграфіі *[1; 2; 3]*. Гэты артыкул характарызуе працэс стварэння і дзейнасці медыцынскай секцыі (медсекцыі) Інбелкульта ў сярэдзіне 1920-х гадоў.

У дарэвалюцыйны перыяд развіццё беларускай медыцынскай навукі ў значнай ступені стрымлівалася як адсутнасцю адзінага каардынацыйнага цэнтра накшталт акадэміі, так і разбурэннем сеткі ўстаноў вышэйшай

**ПРА АЎТАРА**

КАПЛІЕЎ Аляксей Аляксандравіч.

Нарадзіўся ў 1991 годзе ў Мінску. Скончыў гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны (2014), магістратуру гэтай ВНУ (2015), аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2018).

У 2014–2015 гадах працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам, у 2014–2015 гадах – старшым захавальнікам фондаў музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. У 2017–2018 гадах – вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці. З 2018 года – навуковы, з 2019 года – старшы навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук (2018), дацэнт (2022).

Аўтар 130 навуковых публікацый, у тым ліку дзвюх манаграфій.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Беларусі міжваеннага перыяду, гісторыя медыцыны і аховы здароўя, медыка-санітарнае забеспячэнне насельніцтва і супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы падчас ваенных канфліктаў першай чвэрці ХХ стагоддзя.

адукацыі, што было выклікана рэакцыяй царскай улады на падзеі паўстанняў 1830–1831 і 1863 гадоў. Аднак, нягледзячы на адсутнасць ВНУ, у Беларусі працягваліся навуковыя медыцынскія даследаванні, яны ажыццяўляліся ў межах дзейнасці ўтвораных у сярэдзіне XIX – пачатку XX стагоддзя лекарскіх гурткоў. Вядучым сярод іх было Таварыства мінскіх лекараў. Аднак з пачаткам Першай сусветнай вайны актыўнасць медыцынскіх таварыстваў прыпынілася, што было абумоўлена масавай мабілізацыяй лекараў-навукоўцаў, а таксама акупацыяй значнай часткі тэрыторыі Беларусі. На момант усталявання савецкай улады ў Беларусі адсутнічалі не толькі магчымасці для падрыхтоўкі лекараў, але і буйныя цэнтры развіцця медыцынскай навукі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года і стварэння Беларускай Савецкай Рэспублікі (ССРБ, БССР) развіццё медыцынскай навукі павінна было паскорыцца: у 1919 годзе было абвешчана аб стварэнні медыцынскага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ), аднак польская акупацыя прыпыніла гэты працэс.

Толькі ў кастрычніку 1921 года ў БДУ быў разгорнуты медфак, выкладчыкі якога адыгралі прыкметную ролю ў станаўленні медыцынскай навукі ў ССРБ *[4, арк. 15]*. Важнае значэнне ў развіцці навукова-медыцынскіх даследаванняў мела аднаўленне дзейнасці Навуковага таварыства мінскіх лекараў (1922), а таксама праца Бабруйскай і Барысаўскай секцый лекараў і іншых рэгіянальных аб'яднанняў медыкаў *[5, арк. 18–21]*.



ПРАТАКОЛ

Першага Арганізацыйнага сходу Медычна-Ветэрынарнае Секцыі Інстытуту Беларускае Культуры 9 красавіка 1924г.

Прысутнымі былі: д-р Калітоускі, Д-р Быліноскі, д-р Фурс, д-р Цьвікевіч, ветэр.д-р Серада, студ.-мэд.Каравайчык і студ.медык Курыловіч.

Павестка:

I. Утварэньне Медычна-Ветэрынарнай Секцыі.

2. Выбары прэзыдыуму секцыі.

| Слухалі: | Пастанавілі: |
|---|---|
| I. Аб утварэньні Секцыі. | I. |
| I/ прамова д-ра Цьвікевіча ад імя Прэзыдыуму Інстытуту Беларускай Культуры аб неабходнасьці стварэньня Медычна-Ветэрынарнай Секцыі. | I/ Утварыць Медычна-Ветэрынарную Секцыю Інбелкульта на грунце агульнага статуту для секцыяу Інбелкульта. Сябрамі секцыі лічыць: 1/Д-ра Быліноскага, 2/д-ра Калітоускага, 3/д-ра Фурса, 4/ студ.мэд.Каравайчыка, 5/ студ.мэд.Курыловіча, 6/ вет.д-ра Сераду, 7/ д-ра Цьвікевіча. |
| 2/ Прамова Ветэр.д-ра Серады аб неабходнасьці дзеля тэхнічных прычынаў часовага аб"яднаньня беларуск. медыц. і ветэр. працаўнікоў у адной секцыі. | |
| II. Выбары часовага Прэзыдыуму секцыі. | II. Абраць часовы прэзыдыум секцыі з 3 асоб.: Старшынёю - д-ра Цьвікевіча, Нам.Старшыні - вет.д-ра Сераду, Сакратаром - студ-мэд.Курыловіча. |
| III. Аб пляне працы Секцыі. | III. Плян працы Секцыі даручыць апрацаваць д-ру Цьвікевічу на грунце абгавораннага праекту. |

Старшыня

Сакратар.

**Копія пратакола арганізацыйнага пасяджэння медычна-ветэрынарнай секцыі Інбелкульта, 9 красавіка 1924 года**
Крыніца: ЦНА НАН Беларусі – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 11. Арк. 32.

Аднак дзейнасць членаў медыцынскіх таварыстваў і навукоўцаў БДУ насіла дыскрэтны характар і ў значнай ступені мела патрэбу ў каардынацыі. Падобныя тэндэнцыі былі характэрны і для іншых галін навукі, што абумовіла неабходнасць арганізацыі адзінага цэнтра іх развіцця. Менавіта такім цэнтрам стаў створаны ў 1922 годзе Інстытут беларускай культуры, які атрымаў статус вышэйшай дзяржаўнай навуковай установы ў БССР *[6, с. 5]*.

У першыя гады існавання навуковая актыўнасць Інбелкульта канцэнтравалася пераважна на праблемах гуманітарыстыкі: беларускага мовазнаўства, гісторыі, літаратуры, этнаграфіі. Вылучэнне прыродазнаўчага профілю адбылося толькі ў 1924 годзе. Рашэннем агульнага сходу Інбелкульта ад 26 сакавіка 1924 года ён быў пашыраны на сем новых секцый, у лік якіх увайшла і «медычна-ветэрынарная», арганізаваць якую было даручана лекару І. Цвікевічу. Варта адзначыць, што менавіта з моманту гэтага пашырэння Інбелкульт пачаў ператварацца з выключна гуманітарнай у комплексную навуковую ўстанову *[3, с. 46]*.

Секцыя фармальна пачала сваю працу 17 красавіка 1924 года, аднак з улікам рэарганізацыі Інбелкульта фактычны працэс стварэння медсекцыі заняў больш за год, таму яе першы арганізацыйны сход быў прызначаны на 13 лютага 1925 года. Медсекцыю ўзначаліў наркам аховы здароўя БССР М. Барсукоў, у



**Прэзідыум медсекцыі Інбелкульта: Іван Іванавіч Цвікевіч, Міхаіл Іванавіч Барсукоў, Павел Віктаравіч Трамповіч, 1926 год**
Крыніца: Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) / апрац. А. І. Цвікевіч. – Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – С. 72.

склад Прэзідыума секцыі ўвайшлі І. Цвікевіч (намеснік старшыні) і П. Трамповіч (сакратар) *[7, арк. 8, 21]*. На думку ўлад БССР, Інбелкульт мусіў стаць не толькі цэнтрам, але і каталізатарам развіцця навукі ў рэспубліцы, што выяўлялася ў росце супрацы з дзяржаўнымі органамі. Напрыклад, у пастанове Савета Народных Камісараў (СНК) БССР «Аб Інстытуце беларускае культуры» ад 10 ліпеня 1926 года рэкамендавалася «ўзмацняць існуючую сувязь з адпаведнымі дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі» *[8, с. 30]*. Таму прызначэнне кіраўніком медсекцыі Інбелкульта М. Барсукова дэманстравала агульны ўхіл на шчыльную супрацу з Народным камісарыятам аховы здароўя (НКАЗ) БССР і кансалідацыю намаганняў асноўных навукова-медыцынскіх цэнтраў краіны пад наглядам НКАЗ праз своеасаблівую «асабістую унію». Так, у справаздачы Інбелкульта за люты – жнівень 1925 года адзначалася, што медсекцыя «ўвязвала сваю працу з дзейнасцю Наркамздрава і медфака [БДУ]» *[9, с. 118]*.

Права ўключэння ў секцыю меў кожны лекар БССР, для чаго мусіў падаць заяву (з анкетнымі звесткамі) і прайсці зацвярджэнне агульным сходам медсекцыі, у склад якога ўвайшлі вядомыя лекары і вучоныя БССР, усяго 65 чалавек *[1, с. 208; 10, арк. 23]*. Фармальна ў медсекцыю маглі ўваходзіць як штатныя члены Інбелкульта, так і супрацоўнікі сістэмы аховы здароўя з рэгіёнаў, якія трымалі сувязь ліставаннем, рыхтавалі артыкулы, выконвалі асобныя заданні секцыі. У выніку большасць супрацоўнікаў медсекцыі з'яўляліся пазаштатнымі, што стала адметнай асаблівасцю яе працы на працягу існавання *[2, с. 6]*. Так, у 1925–1926 гады ў каштарысе медсекцыі засталася толькі адна штатная адзінка намесніка старшыні секцыі *[3, с. 148]*.

Усе ўдзельнікі медсекцыі мусілі весці навуковую працу па абранай тэме. На трэцім пасяджэнні медсекцыі 19 сакавіка 1925 года старшыня М. Барсукоў вылучыў толькі два тыдні на пошук тэмы. Па заканчэнні гэтага тэрміну ўсе, хто не ўзяў навуковую тэму, механічна выключаліся з ліку сяброў секцыі *[10, арк. 18]*. План працы медсекцыі Інбелкульта прадугледжваў: складанне беларускай навуковай тэрміналогіі па ўсіх галінах медыцыны; зацвярджэнне літаратуры, падручнікаў, плакатаў для вясковых бібліятэк; дапамогу НКАЗ у яго дзейнасці; збор і распрацоўку матэрыялаў па гісторыі медыцыны Беларусі; пошук звестак пра эндэмічныя хваробы і аналіз іх уплыву на насельніцтва; вывучэнне сутнасці «народнай медыцыны»; даследаванне клімату Беларусі і яго ўплыву на грамадскае здароўе; пошук карысных для здароўя раёнаў і гаючых крыніц; псіхафізічнае даследаванне беларускага сялянства і інш. *[7, арк. 22–22 адв.; 10, арк. 15–15 адв.]*.

Для распрацоўкі навуковых задач медсекцыя, як і астатнія структуры Інбелкульта, падзялялася на шэраг камісій (падсекцый): антрапалагічную; гельмінталагічную; склеромную; валлёвую; тэрміналагічную; бюро па клінічных пытаннях *[11, с. 7]*.

Адным з першых крокаў медсекцыі стала арганізацыя сістэмнага і масавага антрапалагічнага даследавання насельніцтва БССР. Гэту работу, накіраваную ў асноўным на вывучэнне беларускага сялянства, праводзілі карэспандэнты медсекцыі, якія сумяшчалі антрапалагічныя даследаванні з уласнымі медыцынскімі вопытамі і асноўнай працай.

Так, пачаткам сістэмнага антрапалагічнага вывучэння беларусаў у медсекцыі лічыцца даклад старшыні антрапалагічнай камісіі доктара Ю. Лютынскага, які разам са сваім калегам доктарам С. Валачковічам пачалі ў канцы 1924 года даследаванне пацыентаў на базе 2-й мінскай савецкай бальніцы, а таксама падчас клінічнай працы ў вясковай мясцовасці. У аснове аналізу было найноўшае на той час вучэнне германскага прафесара Э. Крэчмера, што «душэўны лад, воля і характар стаяць у шчыльнай біялагічнай сувязі з цялесным абліччам, знешнасцю, фізічным развіццём» *[10, арк. 5–6 адв.]*.

Па выніках трохмесячнага даследавання ў студзені 1925 года Ю. Лютынскі і С. Валачковіч прыйшлі да шэрагу папярэдніх высноў:

– стрыманы і ўзважаны нацыянальны характар беларусаў з'яўляецца наступствам прыхільнасці традыцыям і прынцыпам, абумоўлены схільнасцю да стварэння «моцнавольных індывідуумаў»;

– нягледзячы на акружэнне моцнымі з культурна-гістарычнай і грамадска-эканамічнай пунктаў гледжання этнасамі (рускія, палякі, украінцы), беларусы амаль не былі асіміляваныя, а нацыянальныя рысы насельніцтва нават больш праяўляліся на ўскраінах Беларусі;

– супрацьдзеянне асіміляцыі выклікана жаданнем захаваць чысты нацыянальны тып накшталт ірландцаў, бураў і франкаканадцаў;

– беларуская нацыя мае «сімптомы жывучасці і прагрэсу», што даказваецца моцнай цягай да ведаў, паляпшэннем сельскай гаспадаркі і хуткім фарміраваннем нацыянальнай інтэлігенцыі *[10, арк. 5–6]*.

Ужо 13 лютага 1925 года паведамленне Ю. Лютынскага было заслухана на агульным сходзе медсекцыі, які даручыў яму разам з дактарамі С. Валачковічам і Г. Гольдблатам распрацаваць план даследчай працы ў галіне антрапалогіі *[10, арк. 14–14 адв.]*. У выніку да канца лета 1925 года антрапалагічная камісія сабрала каштоўны матэрыял для вывучэння «антрапалагічнага тыпу беларуса» шляхам раскопак і вымярэння чарапоў, абмеру «жывой натуры», а таксама спрабавала стварыць «расава-біялагічны індэкс беларускага сялянства» праз спецыяльны аналіз крыві *[9, с. 118]*. Толькі за 1924 год было арганізавана антрапалагічнае вывучэнне больш за 400 сялян, узята каля 500 проб крыві *[2, с. 6]*.

Асаблівасцю працы медсекцыі стаў практычна арыентаваны характар навуковай дзейнасці, накіраваны на дапамогу НКАЗ БССР, што адлюстроўвала надзённыя праблемы грамадскага здароўя Беларусі 1920-х гадоў. Напрыклад, наяўнасць

**Першы аркуш справаздачы медыцынскай секцыі Інбелкульта, 1926 год**
Крыніца: ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 11. Арк. 89.


Справаздача
Мэдычнае Сэкцыі. 89

Мэдычная сэкцыя пачала праца-
ваць у сакавіку 1924 году.
Што тыдзень адбываліся пасяд-
жэньня сэкцыі, на якіх разгля-
даліся пытаньні, правапісна,
тэрміналёгіі і арганізацыі.
Пасьля рэарганізацыі Інстытуту
Беларускае Культуры, у сэкцыі
быў выбраны прэзыдыум у складзе
т. М. І. Барсукова у якасьці стар-
шыні, нам. старш. Цвікевіча
[illegible] і Навуковага Сэкратара П. В.
Трухановіч.
Праца сэкцыі праходзіла у камі-
сіях сэкцыі і агульных сходах.
Камісіі у сэкцыі працавалі:
1. Тэрміналёгічная камісія склала
1000 тэрмінаў на лацінскае, расій-
скае і беларускае мовах. Камі-
сія паставіла сабе за мэту
перакласьці на беларускую мову
т. з. Базэльскую анатомічную
номэнклатуру: Nomina anatomica
Albae Ruthenae, чым прасоўваць
беларускую мэдычную тэрміна-
лёгічную справу да сусьветнай
тэрміналёгічнае працы у галіне
мэдыцыны.
Дзеля выкананьня гэтае пра-
цы, камісіі прыйшлося пера-

адасобленай гельмінталагічнай камісіі паказвае, наколькі была вострай неабходнасць барацьбы з чарвякамі-паразітамі, якія распаўсюдзіліся ва ўмовах ваеннага часу. Склеромная камісія за першы год працы зрабіла важную аналітычную работу па абагульненні сведчанняў пра стан і тэмпы росту небяспечнай вочнай хваробы – склеромы, і на гэтай падставе склала карту распаўсюджвання захворвання на Міншчыне *[10, арк. 88 адв.]*. Валлёвая камісія даследавала раёны, дзе быў найбольш распаўсюджаны зоб, і паставіла на ўлік хворых на яго па Мінску, Аршанскай і Віцебскай акругах, вывучала спосабы прафілактыкі гэтай хваробы *[3, с. 152]*.

Важнай часткай працы секцыі стаў збор санітарнай статыстыкі па БССР, што з'яўлялася значным унёскам у дзейнасць НКАЗ у межах аналізу развіцця эпідэмічнага захворвання, стану грамадскай санітарыі, эфектыўнасці медыцынскіх устаноў. Гэтыя мерапрыемствы ажыццяўляліся пры дапамозе стварэння шырокай сеткі карэспандэнтаў, якія пастаўлялі звесткі з рэгіёнаў. Выключную ролю адыгрывала адсочванне тэмпаў зніжэння дзіцячай смяротнасці ў параўнанні з дарэвалюцыйным часам і ў дынаміцы за папярэднія гады.

Вялікай сацыяльнай праблемай у БССР заставаліся самагубствы, таму гэта з'ява таксама вывучалася медсекцыяй сістэмна ў нацыянальным, полаўзроставым, псіхаэмацыянальным і прафесійным аспектах *[10, арк. 72–77]*.

Медсекцыя адыграла вялікую ролю і ў працэсе накіраванай санітарнай асветы насельніцтва. У пачатку 1920-х гадоў значная частка грамадзян БССР, асабліва ў вясковай мясцовасці, не валодала нават базавымі ведамі пра санітарную культуру, спосабы засцярогі ад захворванняў, найпрасцейшую бытавую і асабістую гігіену. Між тым прафілактыка пастулявалася як фундамент савецкай аховы здароўя і яе карэннае адрозненне ад дарэвалюцыйнай медыцыны, якая спрабавала лячыць ужо хворых, у той час як савецкая медыцына асноўныя намаганні прыкладала менавіта да папярэджання захворвання. З мэтай асветы насельніцтва супрацоўнікі медсекцыі падрыхтавалі шэраг папулярных брашур і дапаможнікаў, дзе ў даступнай форме тлумачыліся базавыя правілы санітарнай культуры і спосабы падтрымання здаровага побыту ў хатніх гаспадарках.

Варта дадаць, што са стварэннем БССР і прыняццем курсу на беларусізацыю ў 1924 годзе медсекцыя стала адным з цэнтраў распаўсюджвання беларускай мовы ў галіне аховы здароўя *[10, арк. 94]*. Падчас знаходжання беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі навуковыя даследаванні ў галіне медыцыны ажыццяўляліся пераважна на рускай мове. Падобная сітуацыя захавалася да сярэдзіны 1920-х гадоў, калі лекары, асабліва ва ўсходніх губернях, якія пэўны час знаходзіліся ў межах РСФСР, пераважна не валодалі беларускай мовай і не карысталіся ёю ў прафесійнай дзейнасці. Так, справаздача медсекцыі Інбелкульта за 1925 год сцвярджала: «У нас надта мала збеларусізаваных медычных працаўнікоў» *[10, арк. 94]*.










**Папулярныя медыцынскія выданні І. Цвікевіча з серыі «Сялянская бібліятэка», 1923–1925 гады**
Крыніца: Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

У другой палове 1920-х гадоў пытанне паскарэння беларусізацыі ў галіне аховы здароўя набыло неадкладны характар. Згодна з рашэннем урада, медыцынская сфера мусіла перайсці на беларускую мову да канца 1927 года *[12, с. 93]*. Аднак да гэтага часу нават у цэнтры развіцця медыцынскай адукацыі – на медфаку БДУ – толькі 44 вучэбныя гадзіны з агульных 1147 вяліся на беларускай мове, якой валодаў мінімальны працэнт выкладчыкаў (табл. 1) *[13, р. 106]*.

**Табліца 1. Валоданне беларускай мовай на медыцынскім факультэце БДУ ў 1926–1928 гадах**
Крыніца: Маркава, А. Шлях да савецкай нацыі: Палітыка беларусізацыі, 1924–1929 / А. Маркава. – Мінск: Медысонт, 2016. – С. 126.

| Пасада | 1926/1927 акадэмічны год | | 1927/1928 акадэмічны год | |
|---|---|---|---|---|
| | Колькасць выкладчыкаў | Адсотак ад агульнай колькасці | Колькасць выкладчыкаў | Адсотак ад агульнай колькасці |
| Прафесары | – | – | 1 | 4,3 % |
| Дацэнты | 1 | 20 % | 2 | 25 % |
| Асістэнты | 6 | 9,5 % | 35 | 67,3 % |

Значна ўскладняла працэс выкладання на беларускай мове адсутнасць адпаведных падручнікаў, якія выпрацоўваліся паступова намаганнямі супрацоўнікаў медсекцыі, дзеля чаго была вылучана адмысловая камісія *[14, арк. 79]*.

Падрыхтоўка вучэбных дапаможнікаў патрабавала наяўнасці базавага тэрміналагічнага апарату на беларускай мове. Менавіта ўкараненне беларускай тэрміналогіі з'яўлялася перадумовай для пачатку беларусізацыі медыкаў, што прадвызначыла неабходнасць стварэння якаснага і ўсёабдымнага медыцынскага слоўніка. Адказным за яго распрацоўку прызначылі Інбелкульт. У пастанове Прэзідыума Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) БССР ад 2 лютага 1928 года «Аб практычных мерапрыемствах у галіне разгортвання беларусізацыі» асобна ўказвалася: «…даручыць Інстытуту Беларускае культуры паскорыць падрыхтоўку беларускай навуковай тэрміналёгіі…» *[15, с. 3]*.

Яе стварэннем першапачаткова заняўся першы кіраўнік медсекцыі І. Цвікевіч. Складанне тэрміналогіі ажыццяўлялася праз збіранне медыцынскіх тэрмінаў з этнаграфічных крыніц і беларускай літаратуры, праз анкетаванне носьбітаў «жывой народнай мовы», праз пераклад лацінскіх і грэчаскіх тэрмінаў ці ўтварэнне новых, калі існуючы тэрміналагічны апарат не адпавядаў сутнасці паняццяў.

Да лютага 1925 года І. Цвікевіч падрыхтаваў зборнік, які ўключаў 1294 назвы пераважна з анатоміі, але таксама і асобныя тэрміны з «паталогіі,

**Вынікі праверкі медсекцыяй Інбелкульта цыркуляру НКАЗ на адпаведнасць нормам беларускай мовы, 1925 год**
Крыніца: ЦНА НАН Беларусі – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 11. Арк. 34.



На № 1650/38.

У Кіраўніцтва Справамі Савету
Народных Камісараў.

Медычная Сэкцыя Інбелкульту згодна прапазыцыі Наркома Аховы Здароўя разглядзела цыркуляр № 3449 і слоў якія не сустракаюцца у беларускай мове не знайшла пры разгляданьні орыгіналу знойдзена шмат граматычных памылак, якія зроблены пры друкаваньні гэтага цыркуляру.

Старшыня Медычнае Сэкцыі
і Народны Камісар Аховы Здароўя

Сэкратар

паталагічнай анатоміі, бактэрыялогіі» *[16, с. 1]*. Да рэарганізацыі Інбелкульта ў лютым 1925 года зборнік паспеў прайсці «перагляд» (рэдактуру) сіламі дактароў Фурса і Былінскага, а таксама студэнта-медыка Каравайчыка.

Рэарганізацыя Інбелкульта пашырыла склад медсекцыі, а дзейнасць па распрацоўцы тэрміналогіі перайшла ў ведамства асобнай тэрміналагічнай камісіі ў складзе старшыні – лекара І. Цвікевіча, члена – лекара П. Трамповіча, і сакратара – студэнта-медыка П. Каравайчыка. Да жніўня 1925 года было распрацавана больш за 1500 тэрмінаў, што складаюць першую частку гэтак званай Базэльскай наменклатуры (Baseler nomina anatomica), прынятай у 1895 годзе на з'ездзе Нямецкага анатамічнага таварыства ў Базелі. Агулам яна ўключае 30 000 дэфініцый *[9, с. 112]*. Камісія вырашала пачаць распрацоўку з анатамічнай тэрміналогіі, якая мусіла выдавацца пастулова ў фармаце падрабязных падручнікаў для вышэйшай школы. У якасці ўзору выкарыстоўваўся падручнік ардынарнага прафесара Юр'еўскага імператарскага ўніверсітэта А. Раўбера ў апрацоўцы прафесара Берлінскага ўніверсітэта Ф. Копша, як найбольш пашыраны ў расійскіх ВНУ *[16, с. 1]*.

Акрамя гэтага выдання, падмуркам для складання тэрміналагічнага апарату стала анатамічная і фізіялагічная тэрміналогія Я. Драздовіча, вядомы атлас па анатоміі чалавека В. Шпатэльгольца, польскі пераклад Базэльскай тэрміналогіі, выкананы доктарам С. Крысінскім, а таксама спецыялізаваныя медыцынскія і агульныя слоўнікі (усяго 12 назваў). З тэрміналагічнымі мэтамі І. Цвікевіч грунтоўна прааналізаваў таксама расійска-беларускі слоўнік В. Ластоўскага (Коўна, 1924), а П. Каравайчык адшукаў значную колькасць медыцынскіх назваў у дасследаваннях па этнаграфіі Беларусі *[16, с. 2]*.

Тэрміналогія рыхтавалася на трох мовах: лацінскай, рускай і беларускай. Яе складальнікі добра разумелі, што большасць медыкаў у БССР атрымоўвалі прафесійную адукацыю на рускай мове, таму змяшчэнне дэфініцый на ёй мусіла палепшыць засваенне імі беларускай тэрміналогіі *[16, с. 3]*.

У выніку надрукаваная ў першай частцы Nomina anatomica alboruthenica тэрміналогія па астэалогіі і сіндэсмалогіі атрымалася кампілятыўнай: уступная частка выпісана з Крысінскага, лацінскія назвы – з Раўбера, рускі тэкст – з Шпатэльгольца, Раўбера і інш. Рукапіс працы пазней быў вычытаны і выпраўлены на сходах тэрміналагічнай камісіі медсекцыі, а потым накіраваны ў правапісна-тэрміналагічную камісію Інбелкульта *[16, с. 2]*. Кола выкарыстанай літаратуры абмяжоўвалася наяўнымі ў міжваеннай Беларусі выданнямі, аднак з цягам часу іх колькасць павялічвалася. Так, для падрыхтоўкі наступных двух выпускаў, акрамя адзначаных вышэй,



| Termini situm et directionem partium indicantes 1) | Термины, обозначающие положение и направление частей тела | Назвы, што азначаюць палажэньне і кірунак частак цела |
|---|---|---|
| Verticalis 2) | Вертикальный, отвесный | Проставесны |
| Horizontalis 2) | Горизонтальный | Паземны |
| Sagittalis 3) | Сагиттальный, стреловидный | Стрэлаваты, пярэдня-задні |
| 5. Frontalis 4) | Фронтальный, поперечный | Лобны, фронтавы |
| Transversalis 5) | Поперечный (к оси туловища) | Папярочны |
| Medius 6) | Средний | Сярэдні |
| Medianus | Срединный | Сярэдзінны |
| Intermedius | Промежуточный | Міжсярэдні |
| 10. Medialis | Внутренний, квнутри расположенный | Прысярэдні |

**Адна са старонак першага выпуску беларускай медыцынскай тэрміналогіі**
Крыніца: Nomina anatomica alboruthenica, вып. 1. – Менск: [б. в.], 1926. – С. 9.




**Вокладкі трох выпускаў Nomina anatomica alboruthenica, 1926–1929 гады**
Крыніца: Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

**Табліца 2. Тэматычны змест выпускаў беларускай медыцынскай тэрміналогіі**
Крыніца: распрацоўка аўтара на падставе Nomina anatomica alboruthenica, вып. 1. – Менск: [б. в.], 1926. – 110 с.; Nomina anatomica alboruthenica, вып. 2. – Менск: Выданне Інстытуту беларускай культуры, 1927. – 175 с.; Nomina anatomica alboruthenica, вып. 3. – Менск: Выданне Беларускай акадэміі навук, 1929. – 109 с.

| Выпуск | Год выдання | Тэматыка | Колькасць тэрмінаў |
|---|---|---|---|
| I | 1926 | Агульныя анатамічныя тэрміны, астэалогія, сіндэсмалогія | 1790 |
| II | 1927 | Міялогія, спланхналогія, ангіялогія | 2958 |
| III | 1929 | Неўралогія, органы пачуццяў, пакровы, вобласці чалавечага цела | 1960 |

аналізаваліся недаступныя раней тамы анатамічнага атласа Шпатэльгольца, анатомія Бохенэка, шэраг рускіх і нямецкіх выданняў анатоміі Раўбера (табл. 2) *[17, с. 1]*.

Складальнікі падкрэслівалі перадусім прыкладны характар будучага выдання, таму пры яго падрыхтоўцы ўлічваліся прапановы і заўвагі яго будучых карыстальнікаў – выкладчыкаў, студэнтаў і практыкуючых лекараў *[14, арк. 79–79 адв.]*.

Варта адзначыць, што пры стварэнні тэрміналогіі значная ўвага надавалася збору медыцынскіх тэрмінаў ад народных лекараў і знахароў *[1, с. 207]*.

Пры гэтым аўтары падкрэслівалі, што падрыхтаваныя медсекцыяй выданні не з'яўляюцца канчатковымі, а носяць дыскусійны характар і патрабуюць дапрацоўкі з падключэннем усёй зацікаўленай лекарскай грамадскасці *[18, с. 1]*. Няспынная дзейнасць па распрацоўцы навуковай тэрміналогіі неўзабаве дала свае вынікі: калі ў 1924 годзе з васьмі кніг, выдадзеных у БССР па медыцыне, толькі дзве былі на беларускай мове, то ў 1928-м з 28 выдадзеных медыцынскіх кніг беларускамоўнымі з'яўляліся ўжо 13 *[1, с. 208]*.

Варта дадаць, што цяжкая і вельмі важная для развіцця медыцынскай навукі БССР праца медсекцыі праходзіла ў надзвычай складаных матэрыяльна-бытавых умовах. У дакладзе Інбелкульта Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР ад 12 верасня 1926 года адзначалася, што будынак Інстытута ўяўляе «не памяшканне для спакойнай, акадэмічнай працы, але якісьці праходны калідор» *[3, с. 153]*. Медыцынская секцыя не мела нават асобнага пакоя і размяшчалася разам з літаратурнай, а шафу для дакументаў дзяліла з Камісіяй па вывучэнні натуральных вытворчых сіл БССР. Пад неабходны для працы антрапалагічнай камісіі музейна-лабараторны пакой быў вылучаны «чуланчик рядом с уборной» *[10, арк. 4]*.

Шмат цяжкасцей было і ў правядзенні практычных даследаванняў. Як сцвярджалася ў справаздачы антрапалагічнай камісіі ў канцы 1926 года, «…антропологическая работа стала замирать, а потом почти стала.

Прычына – матер[иальные] условия» *[10, арк. 4]*. Асаблівыя цяжкасці адзначаліся ў працы з навуковай тэрміналогіяй, бо яе стваральнікі не забяспечваліся неабходнымі падручнікамі і іншай літаратурай *[10, арк. 94]*.

Пачынаючы з 1926 года, праца Інбелкульта ўсё болей і болей набліжалася да акадэмічных стандартаў. Пастанова СНК БССР «Аб Інстытуце беларускай культуры» намеціла курс на яго пераўтварэнне ў Беларускую акадэмію навук *[19, с. 30]*. У 1927 годзе быў прыняты статут Інбелкульта, які зацвердзіў новую структуру ўстановы. Замест секцый вылучаліся два аддзелы: гуманітарных навук, які падзяляўся на «класы» філалогіі і гісторыі, а таксама аддзел прыроды і гаспадаркі, што ўключаў «класы» гаспадаркі і прыроды. Функцыі медсекцыі ў новай структуры перанялі кафедры антрапалогіі і фізіялогіі, лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, пастаянная гельмінталагічная камісія *[20, арк. 29, 132, 139–142, 148]*.

Медыцынская секцыя Інбелкульта на працягу свайго нядоўгага існавання засяродзіла намаганні перадусім на вучэбна-выдавецкай і асветніцкай дзейнасці, а таксама на даследаванні стану грамадскай санітарыі і распаўсюджвання хвароб сярод насельніцтва. Такім чынам, выконвала найбольш актуальныя на той час задачы для паляпшэння стану грамадскага здароўя.

Пасля рэарганізацыі Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук медыцынскія даследаванні працягваліся, а разам з гэтым узмацнялася іх інтэграцыя з дзейнасцю НКАЗ БССР у шчыльным супрацоўніцтве з іншымі навуковымі і грамадскімі структурамі Савецкай Беларусі.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 09.02.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Касцюк, М.П. Інстытут беларускай культуры / М.П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.
2. Глеб, М. Даследаванні ў галіне медыцыны ў Інбелкульце / М. Глеб // Навука. – 2021. – 22 чэрвеня. – С. 6.
3. Інстытут беларускай культуры: 1922–1928 гг. / У.Р. Гусакоў [і інш.]; рэдкал.: У.Р. Гусакоў [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2022. – 223 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4. Воп. 1. Спр. 121.
5. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 1754. Воп. 1. Спр. 1.
6. Положение об Институте Белорусской Культуры: 8 августа 1924 г. // Собрание узаконений и распоряжений Рабоче-Крестьянского правительства Белорусской Социалистической Советской Республики. – № 18 (30 ноября). – Ст. 161. – С. 5–9.
7. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9.
8. Аб Інстытуце беларускае культуры: пастанова Савету Народных Камісараў БССР, 10 ліпеня 1926 г. // Бюлетэнь Савету Народных Камісараў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. – 1926. – № 9. – С. 29–30.
9. Скалабан, В.У. Інстытут беларускай культуры. 1922–1928: дакументы і матэрыялы / В.У. Скалабан, М.У. Токараў. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 257 с.
10. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 11.
11. Кароткая інфармацыя аб дзейнасці Інстытута беларускай культуры. – Менск: коштам Інстытута беларускай культуры, 1926. – 26 с.
12. Аб практычных мерапрыемствах па правядзеньні нацыянальнае палітыкі: пастан. II сесіі ЦВК БССР VI склікання за 15 ліпеня 1924 г. // Зборнік чынных законаў БССР за 1921–1924 гады. – Мінск: Выд. Нар. камісарыяту юстыцыі БССР, 1927. – С. 91–99.
13. Markova, A. The Path to a Soviet Nation: The Policy of Belarusization / A. Markova. – Schöningh: Brill, 2022. – 295 p.
14. ДАМВ. – Ф. 1754. Воп. 1. Спр. 6.
15. Аб практычных мерапрыемствах па выкананьні пастановы Прэзыдыуму Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК Саюзу ССР па дакладу Ураду БССР аб беларусізацыі: Пастанова прэзідыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, 2 лютага 1928 г. // Савецкая Беларусь. – 1928. – № 23. – С. 3.
16. Nomina anatomica alboruthenica, вып. 1. – Менск: [б. в.], 1926. – 110 с.
17. Nomina anatomica alboruthenica, вып. 2. – Менск: Выданне Інстытуту беларускай культуры, 1927. – 175 с.
18. Nomina anatomica alboruthenica, вып. 3. – Менск: Выданне Беларускай акадэміі навук, 1929. – 109 с.
19. Аб Інстытуце беларускае культуры: пастанова Савету Народных Камісараў БССР ад 10 ліпеня 1926 г. // Бюлетэнь Савету Народных Камісараў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. – 1926. – № 9. – С. 29–30.
20. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 33.